УДК 82.091(476)

# АДЛЮСТРАВАННЕ ПЫТАННЯЎ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў КАНЦЫ XIV – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI СТ. У ДЫСЕРТАЦЫЙНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯХ БЕЛАРУСКІХ ГІСТОРЫКАЎ КАНЦА XX – 10-Х ГГ. XXI СТ.

Мікалаева Л.В.
Учреждение образования «Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники»
(г. Мінск, Беларусь)

У артыкуле аналізуюцца асноўныя дысертацыйныя працы беларускай гістарыяграфіі канца XX – 10-х гг XXI ст., прысвечаныя вывучэнню асобных аспектаў знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XIV – першай паловеXVI ст. Робіцца выснова, што у беларускай гістарыяграфіі знешняя палітыка Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XIV – першай палове XVI ст. застаецца перспектыўным кірункам навуковага вывучэння.

Ключавыя словы: гістарыяграфія; знешняя палітыка; Вялікае Княства Літоўскае.

The article analyzes the main dissertation works of Belarusian historiography of the end of the XX – 10s of the XXI century, devoted to the study of certain aspects of the foreign policy of the Grand Duchy of Lithuania at the end of the XIV – the first half of the XVI century. It is concluded that in Belarusian historiography the foreign policy of the Grand Duchy of Lithuania at the end of the XIV – the first half of the XVI century remains a promising area of scientific study.

Keywords: historiography; foreign policy; the Grand Duchy of Lithuania.

Знешняя палітыка вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) у канцы XIV – першай палове XVI ст., нягледзячы на несумненны навуковы інтарэс яе як праблемы вывучэння, доўгі час не была прадметам асобнага даследавання ў беларускай гістарыяграфіі. У дарэвалюцыйны перыяд пытанні вонкавай палітыкі ВКЛ прыцягвалі мала ўвагі беларускіх даследчыкаў. Сярод праблем знешнепалітычнага характару іх цікавілі пераважна двухбаковыя адносіны ВКЛ з Маскоўскім вялікім княствам, Польшчай, Тэўтонскім ордэнам, татарскімі ханствамі.

У савецкай беларускай гістарыяграфіі ў 1920-я гг. аб'ём літуаністычных даследаванняў значна скараціўся, а ў 1930 – 1940-я гг. яны фактычна спыніліся. Адраджэнне канкрэтна-гістарычных даследаванняў па гісторыі ВКЛ адбылося толькі ў пасляваенны перыяд. Аднавілася вывучэнне маскоўска-літвінскіх адносін XIV – XVI стст., а таксама лёсаў славянскіх зямель, што ўваходзілі ў склад ВКЛ. Але ў даследаванні гісторыі ВКЛ у гэты час дамінаваў рэгіянальны падыход і кожная з рэспублік – Беларусь, Літва, Украіна – цікавіліся толькі мінулым сваёй часткі гэтага былога дзяржаўнага ўтварэння. Такі падыход даў і пэўныя станоўчыя вынікі: быў уведзены ў зварот вялікі фактычны матэрыял, з'явіліся манаграфічныя даследаванні, якія прысвячаліся канкрэтным гарадам і землям. Але былі і недахопы. Так, у той час не было створана спецыяльных работ па гісторыі знешняй палітыкі ВКЛ у канцы XIV – сярэдзіне XVI ст.

Да таго ж, з пачатку 1950-х гг. у беларускай савецкай гістарыяграфіі надоўга зацвердзілася тэндэнцыйная канцэпцыя падзей, якія прывялі да пераходу часткі ўсходніх зямель ВКЛ пад кантроль Маскоўскага вялікага княства на мяжы XV – XVI стст. Сутнасць яе заключалася ў наступным: славянскае насельніцтва ВКЛ ужо ў XV ст. «пакутавала» ад прыгнёту каталіцызму, «імкнулася» перайсці пад уладу Вялікага Княства Маскоўскага і на мяжыXV – XVI стст., дзякуючы паспяховай палітыцы маскоўскага кіраўніцтва, «аб’ядналася» нарэшце з адзінавернымі братамі.

Пасля атрымання Рэспублікай Беларусь дзяржаўнага суверэнітэту пачалося больш глыбокае даследаванне пытанняў знешняй палітыкі айчыннымі гісторыкамі, у тым ліку пытанняў узаемаадносін ВКЛ з суседнімі дзяржавамі ў канцы XIV – сярэдзіне XVI ст. Наступствам гэтага стала з’яўленне шэрагу артыкулаў, змешчаных у перыядычным друку, навучальных дапаможніках, энцыклапедычных выданнях. Частка з іх мела навукова-папулярны і публіцыстычны характар, але ў апошняе дзесяцігоддзе XX ст. вырасла колькасць навуковых публікацый. Менавіта артыкулы найбольш шырока былі прадстаўлены пры рэпрэзентацыі вынікаў даследаванняў беларускіх гісторыкаў па знешняй палітыцы ВКЛ.

З’явіліся ў 1990-х гг. і дысертацыйныя даследаванні, тэматыка якіх была звязана з гісторыяй знешняй палітыкі ВКЛ ў канцы XIV – сярэдзіне XVI ст.У ліку навукоўцаў, што звярталіся на старонках сваіх дысертацый да знешнепалітычных пытаннняў гісторыі ВКЛ разглядаемага перыяду можна назваць даследаванні В.І. Бобышава [1], А.І. Грушы [2], У.І. Канановіча [3], А.А. Любай [4], Л.В. Мікалаевай [5], Ю.У. Сіткевіч [6], М.А. Шніпа [7], А.К. Шымак [8].

Так, у 1997 г. упершыню ў Беларусі У.І. Канановічам была абаронена кандыдацкая дысертацыя па гісторыі дыпламатычных зносін ВКЛ па тэме «Дыпламатыя Вялікага Княства Літоўскага ў 1480 – першай чвэрці XVI ст.: (Адносіны з Вялікім княствам Маскоўскім і Крымскім ханствам)» [3]. Дзякуючы комплекснаму вывучэнню арганізацыі і функцыянавання дыпламатычнай службы ВКЛ у 1480 – першай чвэрці XVI ст., аўтару ўдалося стварыць цэласную і несупярэчлівую карціну прадмета даследавання.Раскрыўшы асаблівасці ўнутранай структурыдыпламатычнай дзейнасці ВКЛ, даследчык прааналізаваў і знешнія акцыі пасольстваў па ўрэгуляванні стасункаў ВКЛ з Маскоўскім вялікім княствам і Крымскім ханствам. Сярод вынікаў, дасягнутых У.І. Канановічам, можна назваць вызначэнне форм ажыццяўлення дыпламатычных кантактаў паміж суседнімі дзяржавамі (дыпламатычнае ліставанне, абмен граматамі, пасольствамі), метадаў, якія выкарыстоўваліся для дасягнення сваіх мэтаў падчас правядзення дыпламатычных перагавораў. Даследчыкам была прапанавана новая класіфікацыя дакументацыі, якая выкарыстоўвалася падчас практычнай рэалізацыі дыпламатычных мерапрыемстваў. Аўтар адным з першых звярнуў увагу на ўзаемаадносіны паміж ВКЛ і Крымскім ханствам. Праведзены аналіз стасункаў ВКЛ са сваім паўднёвым суседам вылучаўся глыбінёй і шматграннасцю. Такім чынам, дысертацыйнае даследаванне У.І. Канановіча

з'явілася важным крокам у развіцці беларускай гістарыяграфіі гісторыі знешняй палітыкі ВКЛ, паклаўшы пачатак рэальнаму навуковаму вывучэнню асобных яе праблем, у першую чаргу дыпламатыі як палітычнага сродка ажыццяўлення знешняй палітыкі.

У пачатку XXI ст. у беларускай гістарыяграфіі можна было назіраць новыя тэндэнцыі ў асвятленні міжнароднага жыцця ва Усходняй Еўропе XIV – XVI стст. Прадметам зацікаўлення беларускіх гісторыкаў стаў заходні кірунак знешняй палітыкі ВКЛ: адносіны са Свяшчэннай Рымскай імперыяй, Тэўтонскім і Лівонскім ордэнамі. Сталі даследавацца пытанні ўплыву ўнутрыпалітычных падзей ВКЛ на яго знешнепалітычнае становішча. Быўзроблены акцэнт на выяўленне знешнепалітычных фактараў, якія ўплывалі на міжнароднае жыццё дзяржаў Усходняй Еўропы, у т.л. ВКЛ.

Шырокае кола праблем закранулася ў дысертацыйным даследаванні В.І. Бобышава «Международные отношения в Восточной Европе в 30-80 гг. XVI в.». У ім гісторык разгледзеў комплекс пытанняў і палітычных фактараў, якія пераважалі ў знешнепалітычнай дзейнасці дзяржаў усходнееўрапейскага рэгіёна. Даследчыку ўдалося прааналізаваць прычыны, характар і вынікі дыпламатычнага і ваеннага супрацьстаяння ВКЛ і Маскоўскага вялікага княства. Гісторыкам было даказана вызначальнае ўздзеянне суперніцтва паміж імі насітуацыю ў міжнародных адносін ва Усходняй Еўропе [1].

У 2001 г. кандыдацкая дысертацыя на тэму «Канцылярыя Вялікага княства Літоўскага 40-х гадоў XV – першай паловы XVI ст.» была абаронена А.І. Грушам. Даследаванне пралівала святло на тэхнічныя бакі ажыццяўлення знешняй палітыкі ВКЛ. Пазней на яго аснове аўтарам была апублікавана аднайменная манаграфія [2]. Адной з важнейшых функцый канцылярыі бяло забеспячэнне практычнай дзейнасці дыпламатычнай службы ВКЛ неабходнымі архіўнымі звесткамі і дакументамі. З кола яе супрацоўнікаў рэкрутаваліся дыпламатычныя агенты. Канцылярыя ажыццяўляла дакументальнае афармленне распараджэнняў гаспадара, паноў Рады і ўхвал соймаў, што датычылі мабілізацыйных і ваенных мерапрыемстваў, мераў фінансавага забеспячэння ўсіх сфераў знешняй палітыкі [5, с. 31]. Такім чынам, унікальнае даследаванне А.І. Грушы запаўняла існуючыя лакуны ў пытаннях практычнай рэалізацыі знешнепалітычных акцый.

Значны комплекс пытанняў гісторыі знешняй палітыкі ВКЛ быў разгледжаны ў дысертацыі Л.В. Мікалаевай«Арганізацыя знешняй палітыкі Вялікага княства Літоўскага ў канцы XV – сярэдзіне XVI ст.». Структурна даследаванне складалася з трох узаемазвязаных частак, у якіх вывучаліся пытанні кіраўніцтва знешняй палітыкай ВКЛ, асноўныя сродкі (палітычныя, ваенныя, ідэалагічныя), формы і метады рэалізацыі, а таксама галоўныя напрамкі ажыццяўлення знешняй палітыкі ВКЛ у канцы XV – сярэдзіне XVI ст. У іх ліку ў даследаванні былі разгледжаны стасункі ВКЛ з Вялікім Княствам Маскоўскім, Польшчай, Тэўтонскім і Лівонскім ордэнамі, Крымскім ханствам, Вялікай Ардой, Малдаўскім Княствам, Венгрыяй, Чэхіяй, Свяшчэннай Рымскай імперыяй, Нагайскай і Астраханскай ордамі, Францыяй, дзяржавамі Апенінскай паўвыспы. Даследчыцай таксама былі асветлены пытанні ўзаемаўплыву

дынастычнай палітыкі Ягелонаў і знешняй палітыкі ВКЛ, уздзеяння рэлігійнага фактару на знешнюю палітыку ВКЛ, дзейнасці кіраўніцтва ВКЛ у ідэалагічнай сферы па стварэнні вобраза «чужога»Маскоўскага вялікага княства ў вачах праваслаўнага насельніцтва ВКЛ[5]. У выніку было сворана першае ў беларускай гістарыяграфіі комплекснае даследаванне менавіта знешняй палітыкі ВКЛ уканцы XV – сярэдзіне XVI ст.

Як вядома, знешнепалітычны курс любой дзяржавы вызначаецца, галоўным чынам, характарам яе ўнутранай палітыкі і ў той жа час істотна ўплывае на апошнюю. Тое, як унутраныя катаклізмы ўплывалі на знешнепалічнае становішча ВКЛ, можна прасачыць па даследаванні М.А. Шніпа«Унутрыпалітычны канфлікт 1508 года ў Вялікім княстве Літоўскім у кантэксце міжнародных адносін ва Усходняй Еўропе »[7]. Аўтар прааналізаваў уплыў паўстання князя М.Л. Глінскага, якое адбылося ў ВКЛ у 1508 г., на развіццё літвінска-маскоўскіх узаемаадносін і на суадносіны палітычных сіл ва Усходняй Еўропе. Па меркаванні даследчыка, М.Л. Глінскамуналежала ініцыятыва стварэння антыягелонскай кааліцыі ў 1510-х гг., мяцежны перабежчык быў пасрэднікам па наладжванні сувязяў вялікага князя маскоўскага Васіля III з імператарам Свяшчэннай Рымскай імперыі Максіміліянам I, Тэўтонскім ордэнам, Саксоніяй у рамках стварэння азначанай кааліцыі. Такім чынам, даследчыку ўдалося стварыць цікавы вобраз асобы князя М.Л. Глінскага, раскрыць уплыў падзей паўстання 1508 г. у ВКЛ на змену яго знешнепалітычнага становішча.

Феномен татарскага ўплыву на ўнутраную і знешнюю палітыку краін Усходняй Еўропы, у тым ліку ВКЛ, таксама прыцягнуў увагу даследчыкаў. У сувязі з гэтым звяртае на сябе ўвагу даследаванне А.А. Любай«Татарскі фактар ва ўзаемаадносінах дзяржаў Усходняй Еўропы ў канцы XV – першай трэці XVI ст.», у якім падымаліся пытанні, што датычаць уплыву татарскіх орд на міжнародныя адносіны ва Усходняй Еўропе ў канцы XV – першай трэці XVI ст. [4]. Даследчыцаахарактарызавала ролю«татарскага фактару» ў знешняй палітыцы ВКЛ, Вялікага Княства Маскоўскага, Асманскай імперыі, Малдаўскага Княства. Асаблівую цікавасць для праблематыкі знешняй палітыкі ВКЛ мае трэцяя глава дысертацыі, дзе абгрунтавана існаванне асобнай «татарскай палітыкі» (адносінаў з Крымскім ханствам) як самастойнага знешнепалітычнага напрамку ў знешняй палітыцы ВКЛ.

Ускосна пытанні знешняй палітыкі ВКЛ былі закрануты ў дысертацыйным даследаванні А.К. Шымак «Внешнеполитические приоритеты России во взаимоотношениях России с Римской Курией (1469-1582 гг.)», прысвечаным заходнееўрапейскаму кірунку дзейнасці дыпламатыі Маскоўскага вялікага княства, пазней Рускага царства[8]. У ім былі прааналізаваны дыпламатычныя акцыі Вялікага Княства Маскоўскага сярэдзіны 60-х – пачатку 70-х гг. XVст., звязаныя з падрыхтоўкай і заключэннем шлюбу вялікага князя маскоўскага Івана III з Зояй (Соф'яй) Палеолаг, з улікам спроб Рымскай курыі дамінаваць у гэтым працэсе.У сваім даследаванні А.К. Шымак паказала, як «слабыя» бакі Рымскай курыі – пытанне царкоўнай уніі і антыасманскай барацьбы – адбіліся на ўзаемаадносінах дзяржаў Усходняй Еўропы і як розныя

фактары (далучэнне Казані і Астрахані, спыненне дынастыі Ягелонаў і г.д.) уплывалі на змену міжнароднага статуса галоўнага знешнепалітычнага саперніка ВКЛ – Вялікага Княства Маскоўскага.

Цікавае даследаванне «Российское государство во взаимоотношениях со странами Восточной Европы (последняя четверть XV – середина 50-х гг. XVI в.)» было падрыхтавана Ю.У. Сіткевіч[6]. У ім аўтар звярнула ўвагу на абставіны фарміравання Вялікім Княствам Маскоўскім кааліцыі, скіраванай супраць дзяржаў ягелонскай лігі, у першую чаргу супраць ВКЛ. Высновы, да якіх прыйшла аўтар, могуці лічыцца новым укладам у гістарыяграфію даследавання праблем міжнародных адносін і пытанняў знешняй палітыкі Маскоўскага вялікага княства і ВКЛ.

Такім чынам, сучасным беларускім гісторыкам удалося пашырыць кола праблем пры вывучэнні асобных аспектаў знешняй палітыкі ВКЛ. Пры гэтым былі выпрацаваны новыя падыходы да іх ацэнкі, зроблены шэраг важных вывадаў. Разам з тым, у беларускай гістарыяграфіі пытанні знешняй палітыкі ВКЛ у канцы XIV – першай палове XVI ст. па-ранейшаму застаюцца перспектыўным кірункам навуковага вывучэння.

Літаратура

1. Бобышев, В.И. Международные отношения в Восточной Европе в 30-80 гг. XVI в.: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.03; 07.00.15/ В.И. Бобышев; Белорус.гос. ун-т. – Минск, 2001. – 21 с.

2. Груша, А. І. Канцылярыя Вялікага княства Літоўскага 40-х гадоў XV – першай паловы XVI ст. / А. І. Груша. – Мінск: Беларуская навука, 2006. – 212 с.

3. Кананoвіч, У. І. Дыпламатыя Вялікага княства Літоўскага ў 1480 – першай чвэрці XVI ст. (Адносіны з Вялікім княствам Маскоўскім і Крымскім ханствам): Дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02/ У. І. Кананoвіч; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 1997. – 95 с.

4. Любая, А. А. Татарскі фактар ва ўзаемаадносінах дзяржаў Усходняй Еўропы ў канцы XV – першай трэці XVI ст.: аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / А. А. Любая;Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2009. – 25 с.

5. Мікалаева, Л.В. Арганізацыя знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XV – сярэдзіне XVI ст.: Дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02/ Л.В. Мікалаева; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. – Мінск, 2003. – 108 с.

6. Ситкевич, Ю.В. Российское государство во взаимоотношениях со странами Восточной Европы (последняя четверть XV – середина 50-х гг. XVI в.): автореф. дис. …канд ист. наук: 07.00.03 / Ю.В. Ситкевич. – Минск, 2018. – 24 с.

7. Шніп, М.А. Унутрыпалітычны канфлікт 1508 года ў Вялікім княстве Літоўскім у кантэксце міжнародных адносін ва Усходняй Еўропе: аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / М.А. Шніп; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. – Мінск, 2009. – 24 с.

8. Шимак, Е. К. Внешнеполитические приоритеты России во взаимоотношениях России с Римской Курией (1469–1582 гг.): автореф. дис. … канд.ист. наук: 07.00.03 / Е. К. Шимак; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2010. – 24 с.